# Культура & art Могилевщина

Информационно-методическое издание в сфере культуры

*Редакционный совет:*

**О.Ф. Хмельков,**
директор УК «Могилевский областной методический центр народного творчества и культурно-просветительной работы»

**И.В. Балавнева,**
заместитель директора

**В.И. Волчкова,**
**А.М. Федосова,**
**Е.И. Хмелькова,**
**Ж.И.Полханова.**

**№ 1**
**2019**

100-ГОДДЗЮ БССР ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

ГОДУ МАЛОЙ РАДЗІМЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

ФЕСТИВАЛИ ПРАЗДНИКИ КОНКУРС

ШЫРОКАЯ МАСЛЕНІЦА НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ

МЕЖДУНАРОДНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО

УЧЕБА КАДРОВ

ШЧЫРА ВІНШУЕМ!

**212030**
**г. Могилев. ул. Первомайская, 10.**
**УК «Могилевский областной методический центр народного творчества и культурно-просветительной работы»**

**http://mogomc.by/**
**e-mail: mogomc@tut.by**

# СОДЕРЖАНИЕ

В.Валчкова. Вынікі работы клубных устаноў Магілёўскай вобласці за 2018 год.......... 3

## 100 годдзю стварэння БССР прысвячаецца

Г.Капусціна. Слаўгарадскі раён святкуе 100-годдзе ўтварэння БССР.......... 16
А.Мишугова.«Сквозь призму столетия» концертно-познавательная программа в ГУК «Дворец искусств г.Бобруйска» .......... 18
Е.Голочева. Праздничное мероприятие, посвященное 100-летию образования БССР прошло в Кличеве..........19

## Году малой радзімы прысвячаецца

Е.Мартынова. Горбанёв Виктор Данилович. Встреча с интересным человеком.......... 20
А.Гвоздерова. Парк семейных деревьев в Глуске.......... 21
О.Нигматуллина. Аллея семейных деревьев заложена в Кировске...22

## Фестивали, праздники, конкурсы

С.Захаренко. X районный смотр-конкурс детского творчества «Прыбяседскія зорачкі».......... 24
С.Соломевич. Районный конкурс «Семья года» - «Многодетная семья -2019».......... 26
О.Алексеева. Конкурсная программа «Многодетная семья – 2019».. 27
С.Захаренко. Районный конкурс «Многодетная семья – 2019»......... 29

## Шырокая Масленіца на Магілёўшчыне

С.Захаранка. «Масленічны перапалох!».......... 31
Г.Луашвили. «Прощай, Масленица!».......... 32
В.Ткачева. Гуляй народ – Масленица у ворот!.......... 34
Т.Островская. Широкая масленица!.......... 35
С.Соломевич. Как на Маслену неделю.......... 36
Е.Ценкер. Масленица-блинница.......... 37

## Международное сотрудничество

В.Волчкова. Новосибирск-Могилев..........38
В.Валчкова. Аматарскі тэатр у сацыякультурным аспекце горада і рэгіёна..........40

## Учеба кадров

В.Валчкова. У аб’ектыве вучоба кадраў..........45
Шчыра віншуем!..........47

# Вынікі работы клубных устаноў Магілёўскай вобласці за 2018 год

**У Магілёўскай вобласці па стане на 01.01.2019. ажыццяўляюць дзейнасць 353 клубныя арганізацыі. Да ўзроўню 2017 года сетка клубных устаноў скарацілася на 4 адзінкі: зачынена 6 устаноў, аднавіў дзейнасць Ланькаўскі СК (Шклоўскі раён), уведзены ў галіновую прыналежнасць Міністэрства культуры Жыліцкі СДК (Кіраўскі раён).**

За 2018 год установамі праведзена 103904 культурных мерапрыемстваў пры заданні 92666 мерапрыемстваў. Выкананне абласнога прагнозлнага паказчыка Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016-2020 гады склала 112,1%. Не выканалі прагнозныя паказчыкі ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Касцюковіцкага раёна» (89,3%), клубнымі ўстановамі г. Бабруйска (72,4%), ДУК «Палац культуры вобласці» (34,6%).

Праведзена 38040 платных культурных мерапрыемстваў, якія наведала 1132661 чалавек. Да ўзроўню 2017 года колькасць платных мерапрыемстваў павялічылася на 0,6%, колькасць наведвальнікаў зменшылася на 3,2%. Не выйшлі на ўзровень 2017 года па колькасці платных мерапрыемстваў раёны: Клімавіцкі (96,2%), Кіраўскі (97,3%), Клічаўскі (96,4%), Краснапольскі (99,6%), Магілёўскі (95,5%), Круглянскі (98%), Хоцімскі (94,1%), Чавускі (90,5 %), установы г.Магілёва (78,5%).

Па ўдзельніках платных мерапрыемстваў не выйшлі на ўзровень 2017 года раёны: Глускі (81,7%), Клімавіцкі (88,5%), Хоцімскі (94,6%), Чавускі (85,5%), Шклоўскі (82,3%), установы г.Магілёва (47,3%), г.Бабруйска 67,2%).

Пры клубных установах вобласці дзейнічае 2 832 клубныя фармаванні (28448 удзельнікаў), у тым ліку 1 468 для дзяцей (14114 удзельнікаў). Да ўзроўню 2017 года колькасць клубных фарміраванняў зменшылася на 0,8%, колькасць удзельнікаў – на 3,2%. Колькасць дзіцячых клубных фарміраванняў зменшылася на 0,9%, удзельнікаў дзіцячых фармаванняў - на 4,5%. Зменшылася колькасць клубных фарміраванняў у раёнах: Горацкі (96,6%), Кіраўскі (91,5%), Клічаўскі (94,7%), Магілёўскі (98,8%), Мсціслаўскі (98,1%), Чавускі (93,8%), ДУК «Палац культуры вобласці» (92,3%).

Усяго ў вобласці дзейнічае 494 творчых калектывы з найменнем «народны», «узорны», у тым ліку 16 калектываў са званнем «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». З іх, пры клубных

установах дзейнічае 256 творчых калектываў з найменнем «народны», «узорны», званнем «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». У 2018 годзе два творчыя калектывы атрымалі найменне «народны»: фальклорны ансамбль «Вясковачка» Васькавіцкага СК ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Слаўгарадскага раёна», клуб аматараў народнай песні «Родныя напевы» Сакалоўскага СК ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чэрыкаўскага раёна».

Эфектыўнай формай падтрымкі аматарскіх калектываў мастацкай творчасці, у прыватнасці вакальна-харавых, застаецца правядзенне аглядаў-конкурсаў, фестываляў, якія дэманструюць іх дасягненні, выяўляюць праблемы і тэндэнцыі развіцця.

У 2018 годзе прайшоў VI Міжнародны форум «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства», які сабраў прадстаўнікоў 12 краін блізкага і далёкага замежжа. У рамках форума праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Нацыянальны касцюм як элемент гістарычнай спадчыны ў сучаснай культуры».

У рамках форума адбылося свята народнай творчасці «Сябрына беларускага майстэрства», майстар-класы па відах беларускіх традыцыйных рамёстваў; фальклорна-гульнявыя праграмы, прэзентацыі-дэгустацыі страў рэгіянальнай кухні, апошнія мерапрыемствы абласнога маштабнага творчага праекта «Скарбніца Падняпроўя» і шмат што іншае.

У г.Клімовічы прайшоў XVII Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка», у ім узялі ўдзел больш 700 удзельнікаў з 5 краін: Беларусі, Расіі, Украіна, Балгарыі, Малдовы.

На базе Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці таксама былі праведзены: абласны агляд-конкурс ветэранскіх аматарскіх калектываў мастацкай творчасці і індывідуальных выканаўцаў XIV рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны», абласны фестываль творчасці інвалідаў «Разам мы зможам больш» арганізацыі АА «БелТІЗ», АА «БелАГ», АА «БелАІ».

Клубнымі ўстановамі за 2018 год праведзена звыш 120 раённых мерапрыемстваў, з іх, звыш 20 рэгіянальных фестываляў, святаў, конкурсаў.

Многія традыцыйныя культурныя падзеі заснаваны на мясцовых традыцыях і лакальнай культуры: рэгіянальнае свята «Святая лялькі» (г. Круглае), рэгіянальны фестываль народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі» (г.п.Дрыбін), этнасвята «У госці ды радзімічаў» (аграгарадок Радамля, Чавускі раён), абрад «Бразгун» і яго складовы элемент - свята Пятра і Паўла ў в.Наркі Чэрыкаўскага раёна, у Слаўгарадскім раёне - традыцыя

паломніцтва і глыбокай пашаны «Блакітнай крыніцы», а таксама VI рэгіянальнае свята-конкурс «Спас - усяму час» і іншыя.

Фестывалі, конкурсы і святы разнапланавай і разнажанравай накіраванасці: гастранамічны фестываль «Гаспадарчы сыр-2018», (Слаўгарадскі раён), рэгіянальны фестываль паэзіі і аўтарскай песні «Пісьмянкоў луг» (г.Касцюковічы), VII рэгіянальны фестываль народнай творчасці «Веснавыя колеры» (Асіповіцкі раён), раённы фестываль народнай творчасці і рамёстваў «Глушанскі хутарок» (п.Глуша, Бабруйскага раёна), рэгіянальнае свята сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст» (г.Мсціслаў), конкурс традыцыйных напояў беларускай кухні «Асалода» (Клічаўскі раён), фестываль сена «Сенафэст-2018» (Кіраўскі раён), гарадскі конкурс дзіцячай творчасці «Звонкі капеж» (г.Магілёў), «Свята варэння» (Чэрыкаўскі раён) і іншыя.

Дзеля падтрымкі аматарскай тэатральнай творчасці праведзены: міжрэгіянальны фестываль-свята аматарскіх тэатраў «Тэатральныя вечарыны» (г.п.Краснаполле), адкрыты гарадскі фестываль аматарскага тэатральнага мастацтва «Святло рампы» (г.Магілёў); тэатральны фестываль «Бялыніцкая тэатральная восень», гарадскі конкурс тэатральнага мастацтва «У святле сафітаў Бабруйск» (г.Бабруйск).

Яркай была палітра культурных мерапрыемстваў Магілёўскай вобласці, што праходзіла пад знакам Года малой радзімы. Клубнымі ўстановамі праведзена звыш 2200 культурных мерапрыемстваў. Гэта конкурсы, фестывалі і святы, змест якіх адлюстроўвала любоў і павагу да свайго горада, сяла, гістарычныя асаблівасці рэгіёна, традыцыі, яго вядомых людзей, творчасць людзей і шмат што іншае: творчы конкурс «Магілёў – наша слава і наша каханне» (г.Магілёў), раённы агляд-конкурс патрыятычнай песні «Песні вайсковых гадоў» (Клімавіцкі раён), раённы моладзевы фестываль сучаснай эстраднай музыкі «Тэрыторыя сустрэч-2018. І зноў спявае моладзь» (Клічаўскі раён), раённы агляд дзіцячых і моладзевых творчых калектываў і выканаўцаў «Хваля збірае сяброў» (Асіповіцкі раён), раённы конкурс маладых талентаў «Зорная дарожка-2018» (Дрыбінскі раён), раённы конкурс творчых калектываў устаноў і арганізацый раёна «Мелодыі роднай старонкі» (Чэрыкаўскі раён). Шэраг іншых формаў культурных мерапрыемстваў: акцыя «За здароўем на веласіпедзе» і флэш-моб «Кіраўшчына – мая малая радзіма» (Кіраўскі раён), спартыўныя спаборніцтвы па матакросе «Мотоформат-2018» (Асіповіцкі раён), экскурсія да месца стаянкі партызанскага атрада Дзмітрыя Мядзведзева (Хоцімскі раён) і іншыя.

Пад знакам Года малой радзімы клубнымі ўстановамі былі ініцыяваны новыя творчыя праекты: адкрыты фальклорны

фестываль «Вытокі» (Асіповіцкі раён), творчы праект «Спадчына малой радзімы» і творчы праект «Клуб у гасцях у клуба» (Бялыніцкі раён), моладзевая гульня-квэст «Чэрыкаўшчына ад вытокаў да сучаснасці», аўта-мота прабег па месцам баявой славы з міні-канцэртамі па населеным пунктам раёна (Бабруйскі раён), раённы агляд-конкурс творчых справаздач «Падарожжа ў мінулае» і раённы конкурс аратых (Быхаўскі раён), раённы агляд-конкурс побытавых танцаў «Танцы Клімаўшчыны» (Клімавіцкі раён), раённы конкурс «Песня маці і сёння жыве» (Краснапольскі раён) і іншыя.

Праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на падтрымку мясцовых паэтаў і пісьменнікаў, якія распачынаюць сваю літаратурную дзейнасць, а таксама па ўшанаванні памяці мясцовых славутасцяў у вобласці літаратуры і мастацтва: раённы літаратурны конкурс аўтарскай паэзіі «Краснапольшчына ў сэрцы маім» (Краснапольскі раён), прэзентацыя зборніка вершаў і абрадаў «Як купалі ў купелі» члена Саюза пісьменнікаў Беларусі і народнага літаратурнага аб’яднання «Роднае словы» паэткі Ніны Кавалёвай (Горацкі раён), літаратурна-музычная сустрэча «Песня роднай зямлі» па творчасці Алеся Казека (УК «МАМЦНТіКАР), выстава жывапісу і графікі па вынікам І рэгіянальнага пленэру «Восень залатая», прысвечанага памяці Анатоля Герашчанкі, літаратурна-музычная кампазіцыя «Нявыдуманыя лёсы герояў А.Церахава», прысвечаная земляку журналісту і пісьменніку (Хоцімскі раён) і інш. Мерапрыемствы па ўпарадкаванасці і акультурванні тэрыторый малой радзімы: конкурс саламяных скульптур сярод клубных установ аграгарадкоў «Золата лета» (Клічаўскі раён), раённы інтэрнэт-конкурс на лепшае афармленне клубнай установы да навагодніх мерапрыемстваў (Магілёўскі раён), конкурс па ўпарадкаванасці сяла «Жыві, квітней, Заеліца родная» (Глускі раён) і інш.

Мерапрыемствы па фарміраванні любові і павагі да роднай мовы, папулярызацыі роднай мовы: літаратурна-музычная кампазіцыя «Родная мова – душа народа», свята роднай мовы «Кахаю цябе, зямлі бацькоўскай словы!» (Бялыніцкі раён), цыкл тэматычных праграм (Касцюковіцкі раён).

Ва ўсіх раёнах прайшлі рэгіянальныя конкурсы рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла», праводзіліся святы вёсак. На прыклад, у Горацкім раёне святы вёсак прайшлі ў рамках грамадска-патрыятычнай акцыі «Мая малая радзіма», ініцыяванай Горацкім раённым Саветам дэпутатаў, раённае свята няісных вёсак «7 сустрэч! А колькі яшчэ будзе!» праведзены ў Клімавіцкім раёне.

Непрафесійныя (аматарскія) калектывы мастацкай творчасці і майстры вобласці выконваюць асаблівую місію па папулярызацыі традыцыйнай культуры Рэспублікі

Беларусь на міжнародным узроўні. На працягу года творчыя калектывы і майстры вобласці прынялі ўдзел больш чым у 120 міжнародных і рэспубліканскіх фестывалях, выставах, конкурсах і святах. У тым ліку, у больш чым 60 культурных падзеях краін блізкага і далёкага замежжа: Расіі, Кітая, Італіі, Латвіі, Украіны, Польшчы, Эстоніі, Галандыі, Балгарыі, Літвы, Азербайджана, Славакіі і іншых:

Міжнародным фестывалі народнай творчасці «Ягілонскі кірмаш» (г.Люблін, Польшча);

XIII Міжнародным фестывалі «Моладзь – за Саюзную дзяржаву» (г.Растоў-на Доне, Расія);

Міжнародным фестывалі «Творчы патэнцыял нацыянальных культур» (гг. Йыхвы, Нарва, Эстонія);

V Міжнароднай выставе-фестывалі «Нунукунст» (г.Талін, Эстонія);

Міжнародным конкурсе «Караван культуры» (Польшча);

Міжнародным фестывалі «Хваля ідэй» (г.Албена, Балгарыя);

Міжнародным фестывалі-конкурсе дзіцяча-моладзевай творчасці «Асамблея мастацтваў у Кітаі»;

I міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў «Дзіцячая Новая Хваля - 2018» (г.Масква, Расія);

XX Міжнародным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці «Памежжа-2018» (пгт. Шумячы, Смаленская вобласць, Расія);

Міжнародным конкурсе фатаграфіі, дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва «Светлае свята Вялікадня» (г.Варонеж, Расія);

XVIII міжрэгіянальным універсальным гандлёва-раздробным кірмашы «Курскі Карэнскі кірмаш-2018»;

VII Міжрэгіянальным творчым фестывалі славянскага мастацтва «Рускае поле» (г.Масква, Расія);

XVII Усерасійскім фестывалі народных мастацкіх промыслаў «Майстроў народных братэрства» (г.Гарадзец, Ніжагародская вобласць, Расія) і іншых.

У 2108 годзе падпісана пагадненне аб культурным супрацоўніцтве паміж установай культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы» і аўтаномнай установай Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі – Югры «Акруговы Дом народнай творчасці». У рамках дамовы ў снежні 2018 года творчая дэлегацыя Магілёўскай вобласці пряняла ўдзел ва Ўсерасійскім з'ездзе Дзедаў Марозаў у г.Ханты-Мансійску (УК «МАМЦНТіКАР, Клімавіцкі раён).

**Дзейнасць дамоў, цэнтраў рамёстваў**

У мэтах стварэння ўмоў для развіцця народных мастацкіх рамёстваў у Магілёўскай вобласці дзейнічае 17 Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў і Быхаўскі раённы Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў, з якіх 6 размешчаны ў сельскай мясцовасці.

Дзейнасць раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў Магілёўскай вобласці накіравана на выяўленне

і вывучэнне, развіццё і папулярызацыю традыцыйных народных рамёстваў рэгіёнаў; развіццё сучасных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, павышэнне прафесійнага майстэрства майстроў вобласці, уцягненне ў працэс навучання і адраджэння традыцыйных народных рамёстваў маладога пакалення.

Асноўныя віды рамёстваў, якія атрымалася захаваць і адрадзіць на тэрыторыі Магілёўскай вобласці пасрэдніцтвам дзейнасці дамоў, цэнтраў рамёстваў – саломапляценне, шапавальства, дрэваапрацоўка, ткацтва, вырабы з паперы, кераміка і ганчарства, лозапляценне, гафт, бондарства, карункапляценне і іншыя. Развіваюцца сучасныя накірункі дэкаратыўна-прыкладной творчасці: бацік, тэкстыльная лялька, папяровая пластыка, квілінг, фільцаванне, ф'юзінг, дэкупаж, тэста-пластыка, тапіярый і іншыя.

За 2018 год дамамі, цэнтрамі рамёстваў арганізавана звыш 1100 выстаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, у тым ліку і па розным відам народных мастацкіх рамёстваў Магілёўшчыны. З іх 104 персанальныя выставы. У кожнай установе афармлены пастаяннадзейныя выставы, для абнаўлення і папаўнення якіх праведзена каля 70 даследча-этнаграфічных экспедыцый. Экспедыцыйная работа таксама спрыяе выяўленню новых майстроў традыцыйных беларускіх рамёстваў, дэкаратыўна-прыкладной творчасці, папаўненню фонду матэрыялаў пра тэхналогіі традыцыйных рамёстваў, абрадаў рэгіёна і іншага матэрыялу.

Дзеля падтрымкі і развіцця народных мастацкіх рамёстваў, павышэння творчага ўзроўню майстроў Магілёўшчыны рэалізоўваліся абласныя творчыя праекты: абласны конкурс аксэсуараў і элементаў традыцыйнага і стылізаванага народнага касцюма «Свет формы і колеру»; абласны конкурс на лепшую творчую работу «Мая малая Радзіма», конкурс на лепшы купальскі касцюм «Купаліш і Купалінка», лепшы роставы купальскі касцюм і іншыя.

У абласным конкурсе на лепшую творчую работу «Мая малая Радзіма»

**Дыпломам Гран-пры** ўзнагароджана *Верменіч Алена Дзмітрыеўна, майстар па лапікавай тэхніцы, г.Магілёў.*

**Дыпломамі I ступені** ўзнагароджаны:

у намінацыі «Мая малая радзіма»

*Жэлабкевіч Юлія Ігараўна, Кухціна Ірына Генадзеўна, Аскаленка Марына Аляксандраўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г.Быхава»,*

*Сцепанькова Галіна Анатолеўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў і мастацкіх рамёстваў г. Горкі».*

у намінацыі «Мая малая радзіма» (кампазіцыя)

*Дрыбінскі раённы Дом рамёстваў аграгарадка Кароўчына ДУК «Дрыбінская цэнтралізаваная клубная сістэма»,*

*Яшчанка Любоў Міхайлаўна, народная студыя дэкаратыўна-*

*прыкладнога мастацтва «Добрасць» раённага Цэнтра культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Крычаўскага раёна».*

**у намінацыі «Лепшы сувенір пра малую радзіму»**

*Чараповіч Тацццяна Міхайлаўна, ДУК «Дрыбінскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей»,*

*Северцава Тацццяна Уладзіміраўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў і мастацкіх рамёстваў г.Горкі».*

**у намінацыі «Дробная сувенірная прадукцыя пра родны край»**

*узорная студыя дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва «Радуга», раённы Дом рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Мсціслаўскага раёна».*

**У абласным конкурсе аксэсуараў і элементаў традыцыйнага і стылізаванага народнага касцюма «Свет формы і колеру» Дыпломам Гран-пры** ўзнагароджана *Сцепанькова Галіна Анатольеўна, народнае аматарскае аб'яднанне «Лазінка» раённага Дома рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Горацкага раёна»*

**Дыпломамі I ступені** ўзнагароджаны:

**у намінацыі «Аксэсуары і элементы да сучасна-стылізаванага народнага жаночага і мужчынскага касцюма»:**

*Іўлева Таццяна Міхайлаўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г. Быхава»;*

*Жэлабкевіч Юлія Ігараўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г. Быхава»;*

*Кухціна Ірына Генадзеўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г. Быхава»;*

*Сіроціна Таццяна Уладзіміраўна, Дом рамёстваў вёскі Кароўчына ДУК «Дрыбінская цэнтралізаваная клубная сістэма»;*

*Князева Кацярына Юр'еўна, народная студыя выяўленчых мастацтваў раённага Цэнтра культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Крычаўскага раёна»;*

*Краснікава Людміла Пятроўна, раённы Дом рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Хоцімскага раёна»;*

*Бяляева Ірына Мікалаеўна, Гронаўскі сельскі Дом культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чэрыкаўскага раёна».*

**у намінацыі «Аксэсуары і элементы да традыцыйнага жаночага і мужчынскага касцюма»:**

*Літвінава Юлія Міхайлаўна, ДУК «Палац мастацтваў г. Бабруйска»;*

*Арт-студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Сувязь часоў» культурна-спартыўнага Цэнтра транспартнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўскае аддзяленне Беларускай чыгункі»;*

**Намінацыя «Тканыя паясы да традыцыйнага народнага касцюма (жаночага, мужчынскага)»**

*Рыбак Аляксандра Генадзеўна, ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў №1 г.Асіпавічы»;*

*Лямцава Ларыса Міхайлаўна, раённы Дом культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Круглянскага раёна».*

Шырокамаштабная выстава-кірмаш рамёстваў «Горад майстроў» прайшла ў рамках мерапрыемстваў V Форума рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Такі супольны праект упершыню рэалізоўваўся ў рамках Форума рэгіёнаў за ўсе гады яго правядзення. Гэта быў сапраўдны фестываль творчай супольнасці майстроў усіх рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і 17 рэгіёнаў Расіі.

З мэтай папулярызацыі традыцыйных рамёстваў, падтрымкі дзеючых майстроў, і майстроў якія пачынаюць сваю дзейнасць, арганізоўваліся тэматычныя пляцоўкі, выставы, выставы-кірмашы вырабаў майстроў вобласці ў рамках міжнародных, рэспубліканскіх, абласных фестываляў, конкурсаў, святаў, што праводзяцца на тэрыторыі вобласці:

тэматычныя інтэрактыўныя выстаўныя пляцоўкі кірмашовых вуліц «Купальскія дзівосы»: вуліца Беларуская – пляцоўкі абласцей Беларусі; вуліца Міжнародная – пляцоўкі Расіі, Украіны, Латвіі, Эстоніі, Літвы, вуліца Прыдняпроўская – пляцоўкі рэгіёнаў Магілёўскай вобласці, вуліца «Сарачынскі кірмаш», у рамках рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»);

выстава-продаж вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і майстар-класы майстроў Магілёўшчыны «Фестывальныя ўзоры» ў рамках XVII Міжнароднага фестывалю дзіцячай творчасці «Залатая пчолка»;

выстава-кірмаш «Ураджай талентаў Магілёўшчыны» у рамках абласных мерапрыемстваў, прымеркаваных Дню працаўнікоў сельскай гаспадаркі і іншыя.

Апроч таго, дамамі, цэнтрамі на працягу года праведзена звыш 1200 выстаў, звыш 450 майстар-класаў, 16 адукацыйных семінараў для спецыялістаў клубных устаноў. Арганізуюцца культурныя мерапрыемствы па папулярызацыі творчасці майстроў, павышэнні іх прафесійнага майстэрства.

У Крычаўскім раёне прайшоў II мастацкі пленэр «Крыніцы натхнення» з удзелам мастакоў рэгіёнаў Расіі, пленэр керамістаў – у Бабруйскім раёне, у Мсціслаўскім раёне – мастацкія пленэры пад назвай «Крыніцы натхнення» з удзелам мастакоў, скульптараў – членаў Саюза мастакоў Расіі з Ліпецка, Пскова, Тулы, Смаленска, Масквы.

Шэраг конкурсаў і выстаў раённага ўзроўню: конкурс па пляценні саламяных упрыгожанняў, саламяных колераў (Глускі раён), выстава «Кірмаш Горацкіх талентаў», прысвечаная 80-годдзю ўтварэння Магілёўскай вобласці (Горацкі раён), конкурс-выстава «Абярэгі нашых продкаў», выстава-конкурс «Калядная зорка» (Быхаўскі раён), конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Жывое дрэва рамяства» (Краснапольскі раён), персанальныя выставы самадзейных мастакоў Юліі Кравец і Сяргея Хіжняка (г.Бабруйск).

У Дрыбінскім раёне Кароўчынскі Дом рамёстваў уключаны ў экскурсійны маршрут па знакамітых месцах раёна, у рамках якога праводзяцца экскурсія выходнага дня для школьнікаў раёна. Праведзена 33 экскурсіі па выстаўнай зале Дома рамёстваў. Дом рамёстваў наведалі жыхары раёна, госці з розных гарадоў і вёсак Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Італіі.

У Мсціслаўскім раёне паспяхова рэалізуецца праектная дзейнасць. Праект-акцыя «Малой радзіме прысвячаецца...» быў скіраваны на прыцягненне жыхароў раёна, майстроў і ўмельцаў, рамеснікаў да ўдзелу ў дзейнасці па захаванні традыцыйных рамёстваў, аб'яднаць майстроў у адну зацікаўленую супольнасць. У рамках праекта была арганізавана серыя выстаў фатаграфій і карцін мясцовых самадзейных мастакоў, прынялі ўдзел больш 20 чалавек. Праект «Майстэрня народных рамёстваў – навучанне розным відам народных мастацкіх рамёстваў беспрацоўных і людзей з фізічнымі асаблівасцямі. На базе раённага Дома рамёстваў г.Мсціслава былі створаны навучальна-творчыя майстэрні па накірунках: саломапляценне, асновы керамікі, вязанне, гафт, ткацтва паясоў, роспіс па шкле і кераміцы.

У Касцюковіцкім раёне выбіраюць лепшага майстра дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў рамках раённага фестывалю народнай творчасці «Крыніца душы».

Спецыялістамі дамоў, цэнтраў рамёстваў праводзіцца шмат камерных формаў працы па далучэнні розных катэгорый насельніцтва да відаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, у тым ліку і да народных мастацкіх рамёстваў. Такія мерапрыемствы знаёмяць яго ўдзельнікаў з народнай творчасцю, даюць шырэйшыя веды пра іх тэхналогіі, праз практычную дзейнасць дапамагаюць асвойваць гэтыя тэхналогіі: ушанаванне актыўных майстроў і ўмельцаў горада «Дзякуем за супрацоўніцтва». (Быхаўскі раён), майстар-класы ў форме «гурток у гасцях у гуртка» (Круглянскі раён), сустрэчы, вечары «Калядныя сустрэчы», «Ля самавара» (Горацкі раён), пазнавальная гульня «Пояс у побыце, традыцыях і абрадах», гульнявая экскурсія па выставе традыцыйнага гафту і ткацтва «Скарбы зямлі Беларускай», тэатралізаваная міні-праграма «Лягенды дзеда Бялына», (Свяцілавіцкі ДР, Бялыніцкі раён), велапрагулка «Знаёмімся з разбяром па дрэве Чорненькім У.А», работа гульнявой пляцоўкі з гульнямі «Эх, лапці мае», «Трапныя лапці», «Хуткія лапці», «З каромыслам па ваду», «Катанне яек», «Наўбіткі» і інш. (Дрыбінскі раён), адкрытыя майстар-класы для насельніцтва ў рамках работы летняй гульнявой пляцоўкі (Быхаўскі цэнтр культуры і рамёстваў), метадычнае аб'яднанне кіраўнікоў гурткоў ДПМ (Краснапольскі раён), экскурсія «Далучэнне да народнай творчасці», выстава народнай творчасці

«З глыбіні сівых стагоддзяў» Слаўгарадскі раён, час фальклору: «Традыцыі продкаў шануем» творчая майстроўня ў перыяд школьных канікул: «Умелые рукі не ведаюць скукі» (Шклоўскі раён, Горадзецкі ДР).

Для арганізацыі работы з майстрамі і ўмельцамі раёнаў у кожным доме, цэнтры рамёстваў створаны банкі дадзеных пра майстроў і ўмельцаў. У базе майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Магілёўскай вобласці налічваецца звыш 400 чалавек, з якіх 21 майстар мае статус народны майстар, 103 з'яўляюцца – членамі саюза майстроў народнай творчасці. У 2018 годзе тры майстры ад Магілёўскай вобласці атрымалі статус «народны»: Кухціна І.Г. (г.Быхаў), Зушчык А.І. і Хізанейшвілі І.У. (г.Горкі) і пяць майстроў пацвердзілі статус народнага майстра.

Для актывізацыі дзейнасці майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці вобласці, павышэння іх мастацкага ўзроўню быў арганізаваны ўдзел 46 майстроў вобласці ў рэспубліканскай выставе сучаснай народнай творчасці «Калядныя ўзоры» і 67 майстроў – у рэспубліканскім фестывалі рамёстваў «Веснавы букет» у г.Мінску. У Міжнародным конкурсе майстроў па кераміцы і ганчарстве «Гліна спявае» ў рамках XXVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі кірмаш у Віцебску» ў намінацыі «Традыцыйная ганчарная форма» дыпломам І ступені ўзнагароджаны Боўда Ю.І., народны майстар Беларусі, дыпломам ІІІ ступені – Арлоў А.В., народны майстар Беларусі (Бабруйскі раён). У намінацыі «Аўтарская дробная пластыка» дыпломам ІІ ступені ўзнагароджана Яшчанка Л.М., член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці (Крычаўскі раён).

Аднак варта адзначыць, што ў дамах, цэнтрах рамёстваў вельмі слабая матэрыяльна-тэхнічная база ў Касцюковіцкім Доме рамёстваў, недастаткова выставачных памяшканняў у Заеліцкім Доме рамёстваў Глускага раёна, Горацкім Доме рамёстваў, для выстаўнай залы ў Клімавіцкім раёне, неабходны майстэрні па працы з глінай у Клічаўскім раёне. Для стварэння спецыялістамі дамоў рамёстваў вырабаў, сувенірнай прадукцыі трэба, перадусім, забяспечыць іх матэрыяламі і патрэбным абсталяваннем, якога практычна няма ў многіх дамах рамёстваў.

**Аўтаклубы.**

Асаблівая ўвага клубных устаноў надаецца абслугоўванню жыхароў аддаленых і маланаселеных пунктаў, якія не маюць стацыянарных устаноў культуры. У вобласці дзейнічаюць перасоўныя ўстановы культуры: 21 аўтаклуб. З улікам колькасці насельніцтва і аддаленасці населеных пунктаў ад вёсак, якія маюць стацыянарныя аб'екты культуры, распрацаваны маршруты выездаў. Выезды аўтаклубаў каардынуюцца і ўзгадняюцца з

райпо, службамі побыту, МНС, РАУС, дамамі сацыяльных паслуг, сельскімі выканаўчымі камітэтамі. У Дрыбінскім, Касцюковіцкім, Хоцімскім, Чэрыкаўскім і іншых раёнах выезды ажыццяўляюцца ў складзе раённага агітцягніка «Забота» і каардынуюцца з раённымі сацыяльнымі службамі.

Ва ўсіх раённых цэнтрах Магілёўскай вобласці для забеспячэння выканання сацыяльных стандартаў у аграгарадках і населеных пунктах, якія не маюць стацыянарных кінавідэаўстановак, а таксама для правядзення выязных кінамерапрыемстваў выкарыстоўваюцца створаныя на базе наяўнага аўтатранспарту аўтаперасоўкі.

У вобласці дзейнічае 21 аўтаклуб, якія займаюцца культурным абслугоўванне звыш за 2,4 тыс. жыхароў. За 2018 год аўтаклубамі вобласці праведзена парадку 5 тыс. культурных мерапрыемстваў. У сярэднім адзін аўтаклуб абслугоўвае 114 населеных пунктаў. Пры гэтым выконваецца шырокі спектр паслуг культуры і спадарожных паслуг, якія праводзяцца непасрэдна ў вёсках на адкрытых імправізаваных сцэнічных пляцоўках, базах дамоў сацыяльных паслуг, фермах, палявых станах, па месцы жыхарства.

Пры аўтаклубах дзейнічае 31 клубнае фарміраванне: рознапланавыя аматарскія аб’яднанні, клубы па інтарэсах, 4 тэатральныя калектывы, 6 вакальна-харавых, з іх два з найменнем «народны» – ансамбль народнай песні «Ровесники» аўтаклуба ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чэрыкаўскага раёна», народны ансамбль народнай музыкі і песні «Жывіца» ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Горацкага раёна».

Асноўнымі формамі работы, найболей прымальнымі для перасоўнай установы культуры і запатрабаванымі сярод жыхароў, з’яўляюцца: канцэртныя праграмы, вечары ўшанавання, віншаванні юбіляраў, народныя абрады і святы, лялечныя спектаклі (батлейка), гульнявыя праграмы для дзяцей, дабрачынныя акцыі па месцы жыхарства па аказанні сацыяльнай дапамогі, віншаванні са святамі і юбілеямі, правядзенне святаў вёсак, землякоў, якія збіраюць вялікую колькасць жыхароў, якія цяпер жывуць ці некалі жылі. У Магілёўскай вобласці шмат населеных пунктаў пацярпела падчас Чарнобыльскай трагедыі і жыхары былі адселены. Аднак цяга да родных месцаў засталася, і аўтаклубы падтрымваюць гэту ініцыятыву, арганізуюць святы-сустрэчы землякоў (Клімавіцкі раён).

У 2018 годзе аўтаклубамі былі рэалізаваны такія формы работы як: творчы праект «Клуб у гасцях у клуба» (Бялыніцкі раён); аўта-мота прабегу па месцах баявой славы з міні-канцэртамі па в.Шчаткава, в.Бояры, в.Ступені, в.Барак, в.Ліпнякі, «Троіцкі кірмаш» вёскі Пятровічы (Бабруйскі раён); выязныя танцавальныя вачарыны,

віншаванне з днём імяніnніка «Толькі раз у год» (Клічаўскі раён); акцыі «Свята ў кожную вёску», калядныя сустрэчы «З песняй у кожную хату» (Крычаўскі раён). Выязная канцэртная акцыя «Родныя напевы» па малых населеных пунктах (Дрыбінскі раён) і іншыя формы.

Падчас правядзення палявых і ўборачных работ на палявых станах арганізуецца ўшанаванне камбайнёраў, святы Першай баразны, абрады «Зажынак» і «Дажынак» і інш. У перыяд засевак і жніва рэалізуюцца творчыя праекты «Клубныя працаўнікі – працаўнікам сяла».

Аўтаклубы ажыццяўляюць культурнае абслугоўванне людзей змешчаных у аддзяленнях кругласутачнага знаходжання, аддзяленнях дзённага знаходжання, цэнтрах карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, шпіталях сястрынскага догляду і інш. У Чавускім раёне ўзята шэфства і ажыццяўляецца пастаяннае культурнае абслугоўванне ГУСА «Рэсцянскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў», ГУСА «Псіханеўралагічны дом-інтэрнат «Расінка».

Кожны аўтаклуб праводзіць этнаграфічныя экспедыцыі па зборы фальклорнага матэрыялу, ажыццяўляе яго апрацоўку, запіс відэаматэрыялаў, стварае архівы мультымедыйных выданняў, арганізуе на падставе гэтых матэрыялаў культурна-пазнавальныя мерапрыемствы, адноўленыя народныя святы і абрады. Яшчэ адным накірункам дзейнасці аўтаклубаў з'яўляецца знаёмства жыхароў з гісторыка-культурнай спадчынай, майстрамі і ўмельцамі раёна. З гэтай мэтай арганізуюцца перасоўныя выставы работ майстроў і жыхароў раёна, якія захапляюцца рознымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выставы раённых устаноў культуры дамоў, цэнтраў рамёстваў і гісторыка-краязнаўчых музеяў. Многія жыхары вёсак захавалі касцюмы традыцыйнага строю, ручнікі, прадметы побыту, што можа ўяўляць цікавасць для сучаснікаў.

Асноўнай праблемай дзейнасці аўтаклубаў з'яўляецца знос транспарта, з-за чаго здараюцца змушаныя прастоі. Толькі два раёны абнавілі транспарт: Хоцімскі і Чэрыкаўскі. Практычна вялікую частку часу знаходзіцца на рамонце аўтаклубы Глускага, Краснапольскага і іншых раёнаў. Як вынік дадзенай праблемы для раённых цэнтралізаваных клубных сістэм – парушэнне графікаў абслугоўвання маланаселеных і аддаленых вёсак, канцэртнага абслугоўвання філарманічных і тэатральных пляцовак, выкананне планаў платных паслуг і іншае.

**Кадры**

У сістэме клубных устаноў працуе 2613 чалавек, з іх служачыя складаюць 58,2% (1520 чалавек). З ліку служачых: 36,3% – кіраўнікоў (551 чалавек), 62,1% –

спецыялістаў (944 чалавек). З ліку спецыялістаў – 77% (727 чалавек) маюць адукацыю па профілі ўстановы, 68% (646 чалавек) – з профільнай адукацыяй.

Па адукацыі (па агульнай колькасці працаўнікоў):

вышэйшая – 19,4%;

сярэдняя спецыяльная – 38,8%;

прафесійна-тэхнічная – 18,1%;

агульная сярэдняя і базавая – 23,6%.

Па адукацыі (служачыя)

вышэйшая – 30,5%;

сярэдняя спецыяльная – 52,2%;

прафесійна-тэхнічная – 10%;

агульная сярэдняя і базавая – 7,1%.

Па ўзроставым складзе служачых:

16-17 гадоў – 0,08%;

18-24 гадоў – 13,2%;

25-29 гадоў – 9,9%;

30-39 гадоў – 23%;

40-49 гадоў – 23,4;

50-54 гадоў – 13,4%;

55-59 гадоў – 8,6%;

Старэй 60 гадоў – 8,4%.

У цяперашні час 4% служачых (105 чалавек) навучаецца ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у тым ліку 20 чалавек паступілі ў 2018 годзе. У тым ліку 69 чалавек атрымліваюць вышэйшую адукацыю, 36 чалавек – сярэднюю спецыяльную.

Кадраваму пытанню таксама варта надаваць пільную ўвагу, асабліва падбору кадраў на вакансіі людзей са спецыяльнай адукацыяй. У шэрагу раёнаў адсутнічаюць спецыялісты ў сельскіх клубных установах Быхаўскага, Дрыбінскага, Магілёўскага раёнах. Працяглы час няма дырэктара ў цэнтралізаванай клубнай сістэме Крычаўскага раёна, дырэктара ў цэнтры рамёстваў, п. Глуша Бабруйскага раёна. Мае месца дэфіцыт кадраў у дамах рамёстваў Краснапольскага, Глускага, Клічаўскага раёнаў.

***В.І. Валчкова,***
***начальнік інфармацыйна-аналітычнага і рэпертуарна-выдавецкага аддзела УК «МАМЦНТіКАР»***

# СЛАЎГАРАДСКІ РАЁН СВЯТКУЕ 100-ГОДДЗЕ ЎТВАРЭННЯ БССР

**З 1 па 3 лютага Слаўгарадскі раён быў насычаны на мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю ўтварэння БССР.**

1 лютага ў раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Слаўгарадскага раёна» адбылося ўрачыстае мерапрыемства «Нашай маладосці колер, нашай Радзімы – гонар». У фае ўсім прысутным была прадстаўлена выстава, распрацаваная дзяржаўнай установай культуры «Цэнтралізаваная сетка публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна» і дзяржаўнай установай культуры «Слаўгарадскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей», на выставе можна было «перагартаць» старонкі векавой гісторыі, а таксама азнаёміцца з развіццём суверэннай Беларусі. Раённым Домам рамёстваў быў зроблены знак 100-годдзя БССР, бутаньерка, якую падарылі ўсім ганаровым гасцям мерапрыемства.




У глядзельнай зале адбыўся святочны канцэрт. Ганаровымі гасцямі былі ў гэты дзень ветэраны вайны, ветэраны працы, раённая ўлада. Пачалося мерапрыемства з выступлення калектыву мажарэтак, дзіцячай школы мастацтваў, які задаў ўрачысты рытм мерапрыемству. Далей быў прадэманстраваны дакументальны фільм аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. З прывітальным словам да ўсіх прысутных звярнулася старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў Язерская Святлана Аляксандраўна.

У святочным канцэрце прымалі ўдзел салісты раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці, народны ансамбль музыкі і песні «Прысожскія музыкі», народны ансамбль народнай песні «Чапурушкі», супрацоўнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, выхаванцы дома дзіцячай творчасці. Усе нумары суправаджаліся гучнымі апладысментамі, а некаторыя, усім вядомыя песні, падпяваліся гледачамі.

2 лютага, у Ржаўскім сацыяльна-культурным цэнтры прайшла пазнавальная праграма «100 гадоў БССР: падзеі, факты»,

# 100 годдзю стварэння БССР прысвячаецца







у якой дзеці прымалі актыўны ўдзел, адказваючы на пытанні і ўдзельнічаючы ў віктарынах. Таксама, удзельнікі вакальнага гуртка, дарылі сваю творчасць аднагодкам.

3 лютага, у Васькавіцкім сельскім клубе, прайшла канцэртная праграма «Гісторыя і сучаснасць», на якім прысутнічалі ганаровыя госці, ветэраны працы. Сваёй творчасцю радавалі ўсіх гледачоў народныя ансамблі «Чапурушкі» і «Вясковачкі», якія працуюць пры дадзенай клубнай установе. Таксама ўспрымаліся гучнымі апладысментамі салісты Людміла і Таццяна Чабатар.

Святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю БССР, у Слаўгарадскім раёне, мелі свой працяг у Новаслабодскім сельскім клубе, Целяшоўскім сельскім Доме культуры і іншых установах.

Святкуючы стагоддзе ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі – мы павінны памятаць пра тое, што з'яўляемся пераемнікамі вялікіх пакаленняў, якія перамагалі на палях бітваў, стваралі нашу эканоміку, навуку, культуру і адукацыю.

***Г.Я. Капусціна, намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Слаўгарадскага раёна»***

# 100 годдзю стварэння БССР прысвячаецца

## «СКВОЗЬ ПРИЗМУ СТОЛЕТИЯ» КОНЦЕРТНО-ПОЗНАВАТЕЛЬНАЯ ПРОГРАММА В ГУК «ДВОРЕЦ ИСКУССТВ Г.БОБРУЙСКА»

**Становление белорусской государственности на советской основе происходило в чрезвычайно сложных геополитических условиях: развязанной Первой мировой войны, революции и Гражданской войны. Несмотря на это Временное рабоче-крестьянское правительство 1 января 1919 года обнародовало Манифест, согласно которому Беларусь провозглашалась «свободной независимой Социалистической Республикой». 1 января 2019 года исполнилось 100 лет со дня провозглашения Белорусской Советской Социалистической Республики (БССР).**






20 февраля 2019 года сектором по работе среди детей ГУК «Дворец искусств г. Бобруйска» проведена концертно-познавательная программа «Сквозь призму столетия» к 100-летию создания БССР для учащихся ГУО «Средняя школа №30 г.Бобруйска».

Открыла концертно-познавательную программу и поздравила всех присутствующих с этой знаменательной датой солистка подготовительной группы народного камерного хора Валерия Новикова. В ее исполнении прозвучали патриотические номера, пронизанные любовью к Родине.

В ходе мероприятия школьники узнали о главных исторических вехах в жизни нашей страны, о БССР – целой эпохе в истории, которая просуществовала почти весь XX век и стала фундаментом для современной белорусской государственности.

В завершении программы был продемонстрирован познавательный видеофильм о создании БССР.

*Алеся Мишугова, методист сектора по работе среди детей ГУК «Дворец искусств г.Бобруйска»*
*Фото Ольга Павколас*

## 100 годдзю стварэння БССР прысвячаецца

# Праздничное мероприятие, посвященное 100-летнему юбилею со Дня образования Белорусской Советской Социалистической Республики прошло в Кличеве

24 января 2019 года в районном Доме культуры города Кличева состоялось праздничное мероприятие, посвященное 100-летнему юбилею со Дня образования Белорусской Советской Социалистической Республики.

С БССР связана целая эпоха в истории нашего государства, эпоха национального и государственного возрождения белорусского народа, всех сфер жизни белорусского общества.

С этой юбилейной датой почетных гостей мероприятия поздравил председатель районного Совета депутатов Книга Владимир Валентинович. В знак уважения и признательности за многолетний вклад в социально-экономическое развитие района почетные гости были награждены юбилейными памятными медалями.





Память о боевых подвигах и деятельности БССР в годы Великой Отечественной войны, запечатлена в музейных экспозициях, исторических мемуарах, фильмах и книгах. Именно о таких исторических событиях рассказывает нам книга «Острова памяти», соавторами которой являются наши земляки Ачинович Лидия Лукьяновна и Судник Алла Васильевна, которые вручили эти книги людям, внесшим вклад в историко-культурное самосознание Кличевского района.

Тематические музыкальные номера дополнили торжественности в атмосферу этого праздника.

*Голочёва Е.П.,*
*методист РЦК ГУК «Централизованная клубная система Кличевского района»*

# Году малой радзімы прысвячаецца

## ГОРБАНЁВ ВИКТОР ДАНИЛОВИЧ.
## Встреча с интересным человеком

24 января 2019 года в УК «Центр досуга и творчества г.Бобруйска» в рамках цикла мероприятий для учащихся ГУО «Гимназия №2» прошла встреча с интересным человеком - директором Бобруйского строительного профессионально-технического колледжа Горбанёвым Виктором Даниловичем, посвященная Году малой родины и 100-летию БССР.





Это была не обычная встреча, были затронуты на первый взгляд простые истины каждого человека, но мало кто в век высоких технологий о них задумывается.

Виктор Данилович начал свой рассказ с русского выражения: «Иван, не помнящий родства». Почему именно с него? Для каждого человека важно знать прошлые поколения, они как никто другие влияют на формирование человека, не зная своих предков, как раньше на Руси, себя можно назвать «Иваном».

Наши бабушки и дедушки, их родители и родители их родителей – это не просто имена, но и определенный образ жизни, способ реакции на разные жизненные ситуации. Неопределенность – вот одна из проблем современного человека, имея множество вариантов, мы теряемся и не знаем какой шаг сделать дальше, изучая историю рода, мы узнаем устои, жизненные правила и понемногу возвращаем себе некую стабильность и определенность.

У каждого человека в подсознании заложены инстинкты, как и у животных, нам хочется создать свою стаю, прайд, а для человека – это семья. Когда мы окружены родными, мы знаем, что не одни в этом мире, даже если родственники давно не с нами, они все равно нас духовно поддерживают и делают нас сильнее.

Виктор Данилович дал ребятам советы, заглядывая в их будущее. Для каждого человека важно знать свой род, достигать еще больших знаний, найти себя в жизни и профессии, реализовав свой потенциал.

5 основных факторов влияющих на наше воспитание: то, что заложено генами наших родных, воспитание в семье, воспитание государством, воспитание улицей, самовоспитание и взяв от них только лучшее, мы станем мудрее и богаче.

*Евгения Мартынова,*
*методист УК «Центр досуга и творчества г.Бобруйска»*

# Году малой радзімы прысвячаецца

## Парк семейных деревьев в Глуске

**21 марта в Глуске сосоялась республиканская акция «Парк семейных деревьев»**

Этой весной в Глуске появился парк семейных деревьев. На торжественной церемонии заложения Аллеи семейных деревьев присутствовало 25 семей, в которых давно поселилось счастье, где на протяжении многих лет горит огонь семейного очага, царят любовь и взаимопонимание. Это многодетные семьи, семьи-победители различных конкурсов, семьи, добившие определенных успехов в профессиональной и творческой сфере, общественной жизни, молодожены, семьи-юбиляры. В этот день семьи Глуска внесли свой вклад в озеленение и благоустройство территории своей малой родины, высадили саженцы липы.






На мероприятии присутствовали: заместитель председателя Могилевского областного комитета инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды Тепляков К.И., первый секретарь Глусского районного комитета Общественного объединения «Белорусский республиканский союз молодежи» Ставская Ю.С., начальник отдела идеологической работы, культуры и по делам молодежи Глусского исполнительного комитета Самуйлик Е.В., начальник Глусской районной инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды Василевский Л.Н.

Все участники акции высадили 25 саженцев липы и установили таблички с семейной фамилией. А это значит, что родной Глуск еще ярче будет расцветать каждую весну и в дальнейшем деревья, как живая изгородь, украсят территорию микроучастка, которая будет радовать взор прохожих.

***А.В. Гвоздерова,***
***методист ГУК «ЦКС Глусского района»***

# Году малой радзімы прысвячаецца

## Аллея семейных деревьев заложена в Кировске

**21 марта 2019 года в Кировске в рамках республиканского проекта прошла акция «Парк семейных деревьев».**

Главная идея акции – устройство «семейного парка», где жители Кировска могут высадить свое фамильное дерево, посвященное важному событию в его семье.

В Год малой родины, в нашей республике, зеленое строительство занимает особое место. Появляются новые скверы, бульвары, благоустраиваются парки, улицы. Расцветает и наша Кировщина.

В акции «Парк семейных деревьев» приняли участие: заместитель председателя Кировского районного исполнительного комитета Татьяна Ивановна Белявская, заместитель председателя Кировского районного исполнительного комитета Вячеслав Витальевич Невинский, председатель Могилевского областного комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды Николай Леонидович Дедков, заместитель начальника управления идеологической работы, главного управления идеологической работы и по делам молодежи Могилевского областного исполнительного комитета Виктор Викторович Бубенцов, заместитель генерального директора по идеологической работе Могилевского государственного производственного лесохозяйственного объединения Сергей Сергеевич Шах, представители трудовых







# Году малой радзімы прысвячаецца



коллективов, общественных организаций и объединений, молодежь.

Когда-то давно существовал обычай: когда рождался сын, сажали на дворе липу, если появлялась дочь – сосну, тополь или березку. Дерево издавна являлось одним из главных символов жизни.

Акция «Парк семейных деревьев» - дань традиции почитания предков и одновременно взгляд в будущее с заботой о грядущих поколениях.

Почетное право закладки Аллеи было предоставлено 13 семьям района, в числе которых те, кто вступили впервые недавно в брак, стали родителями, отмечают юбилей совместной жизни, а также победители районного и областного фестивалей здорового образа жизни «Папа, мама, я – спортивная семья» и районного конкурса «Многодетная семья года».

Закладка Аллеи семейных деревьев стала значимым событием для города. Пусть на многие годы она радует нас своей красотой и силой и станет еще одним местом для отдыха кировчан.

***Ольга Нигаматуллина,***
